**Водгук на аўтарэферат**
**кандыдацкай дысертацыі К.Д Ананькі**
**«Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.»**

У дысертацыі Кірыла Дзмітрыевіча Ананька «Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг.» даследуюцца пытанні станаўлення і асаблівасці развіцця беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Работа адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Аб'ектыўнасць вынікаў навуковага даследавання была дасягнута праз шматбаковы аналіз разнастайных крыніц, вывучэнне і выяўленне сутнасці прадмета даследавання, яго сувязяў з іншымі аб'ектамі гістарычнага працэсу адпаведнага храналагічнага перыяду.

Мэта і задачы дысертацыі вызначылі яе ўнутраную структуру. Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, уводзін, 4 глаў, заключэння і спіса выкарыстаных крыніц. Структура аўтарэферата лагічна вывераная і паслядоўная.

У сваім даследаванні аўтар неаднаразова слушна падкрэслівае, што педагогі і вучні беларускіх гімназій у надзвычай складаных умовах тагачаснага грамадска-палітычнага жыцця здолелі захаваць любоў і павагу да сваёй роднай мовы і беларускай культуры і пранесці іх праз усё жыццё. Акрамя таго падкрэсліваецца, што навуковае даследаванне дадзенай праблемы дазволіць стварыць падставы для ўшанавання памяці аб дзейнасці беларускіх гімназій, што з'яўляецца адной з прыярытэтных задач гістарычнай палітыкі сучаснай Рэспублікі Беларусь.

На аснове статыстычных і біяграфічных дадзеных К.Д. Ананька складзены калектыўны партрэт педагагічнага корпуса і вучнёўскага складу беларускіх гімназій, раскрыты ўдзел беларускіх гімназій у грамадска-палітычных працэсах Заходняй Беларусі ў 1920–1930-х гг., адлюстраваны ўплыў грамадска-палітычных працэсаў на іх унутранае жыццё, а таксама зроблена перыядызацыя дзейнасці гімназій, што з'яўляецца відавочным грунтоўным унёскам у айчынную гуманітарную навуку.

Абгрунтаванасць і надзейнасць канчатковых высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, пацвярджаецца вялікай колькасцю выкарыстаных крыніц, у тым ліку архіўных. Аўтар грунтоўна даследаваў дзяржаўныя архівы Беларусі, у тым ліку рэгіянальныя, а таксама архівы БДАМЛіМ, Цэнтра даследаванняў старадрукаваных выданняў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦДСВіР ЦНБ НАНБ) і архівы Дзятлаўскага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея (ДДГКМ), Мінскага абласнога краязнаўчага музея (МАКМ) і іншых. Некаторыя крыніцы ўводзяцца даследчыкам ў навуковы абарот упершыню, альбо атрымалі новыя трактоўкі. Адначасова неабходна адзначыць адсутнасць у гістарыяграфіі асобнай комлекснай працы, прысвечанай беларускім гімназіям у Заходняй Беларусі, таму рэцэнзуемае даследаванне запаўняе сабой пэўны прабел, існуючы да гэтага ў айчыннай гістарычнай навуцы.

Навуковыя палажэнні, выносімыя на абарону, абгрунтаваны ў тэксце даследавання і знайшлі сваё адлюстраванне ў шматлікіх аўтарскіх публікацыях, у тым ліку і ў выданнях са спісу ВАК Рэспублікі Беларусь.

У выніку дысертацыйнае даследаванне атрымалася багатым на факталагічны матэрыял, на аснове якога суіскальнік робіць уласныя высновы. Высновы аўтара дысертацыі арыгінальныя, аргументаваныя, аб'ектыўныя, канкрэтныя.Палажэнні і вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац па гісторыі Беларусі і гісторыі адукацыі, далейшай распрацоўцы гісторыі Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду, педагагічным і выхаваўчым працэсе, музейнай і краязнаўчай рабоце. Адначасова дысертант падкрэслівае неабходнасць далейшага вывучэння дзейнасці заходнебеларускіх гімназій у міжваеннай Польшчы як часткі беларускай культурнай спадчыны.

Разам з тым, пры складанні калектыўнага партрэта вучняў беларускіх гімназій аўтар сканцантраваўся на аналізе нацыянальных характрыстык, пры гэтым канфесійныя характарыстыкі вучняў не адлюстраваныя у аўтарэферацe. На нашу думку, улічваючы вялікае значэнне канфесійнага чынніка ў палітыцы Польшчы ў Заходняй Беларусі, увядзенне гэтай характарыстыкі ў аналіз толькі ўзбагаціла бы даследванне.

Выказаныя заўвагі не ўплываюць на сутнасць атрыманых вынікаў і не зніжаюць навуковай значнасці праведзенага даследавання.

У цэлым разглядаемы аўтарэферат дысертацыі адрозніваецца якасцю выкладу разглядаемых падзей і фактаў і магчымасцю фарміравання цэласнага ўспрымання, дастаткова поўна раскрывае змест самой дысертацыйнай працы і не ўтрымлівае інфармацыі, якая выходзіць па-за межы яе тэматыкі. Падводзячы вынікі, неабходна адзначыць, што на падставе аналізу аўтрэферата можна зрабіць выснову, што кандыдацкая дысертацыя Кірыла Дзмітрыевіча Ананька адпавядае асноўным патрабаванням, якія прад'яўляюцца для такога тыпа работ, з'яўляецца грунтоўным і закончаным комплексным навуковым даследаваннем, а яе аўтар валодае ўсімі кампетэнцыямі даследчыка і заслугоўвае прысуджэння ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 Айчынная гісторыя.

Даю згоду на размяшчэнне водгука ў глабальнай сетцы Інтэрнэт на сайце ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі".

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі Беларусі
Беларускага дзяржаўнага універсітэта Т.В. Лісоўская

ПОДПИСЬ Лісоўскай УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник управления
организационной работы и
документационного обеспечения
Н.Б. Черкасская
«10» 10 2025